Зінаіда Гасціловіч

Я да цябе ішла

Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі

Зінаіда ГАСЦІЛОВІЧ

Я ДА ЦЯБЕ ІШЛА

Вершы і пераклады

2024

Электронная бібліятэка
Мінскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

Серыя заснавана ў 2023 годзе

Пад рэдакцыяй Р. Ю. Малахоўскага

№ 012

Гасціловіч З.Г.
Я да цябе ішла: вершы і пераклады / Зінаіда Гасціловіч. — Мінск : МАА СПБ, 2024. — 77 с. (Электронная бібліятэка).

“Я да цябе ішла” – так называецца электронны паэтычны зборнік Зінаіды Гасціловіч, у якім сабраны ўласныя вершы, напісаныя ў розныя гады, і пераклады на беларускую мову вершаў класікаў рускай літаратуры: Ясеніна, Крылова, Лермантава, Някрасава.

© Гасціловіч З.Г., 2024
© Падрыхтоўка, афармленне.
ГА “Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі”, 2024

ВЕРШЫ

ЖЫЦЦЁ ЗА ЎСЁ ДАРАЖЭЙ

Месяц моўчкі плыве над зямлёю,
Таямніча пяе асака.
Зачарована ціхім спакоем
Засынае памалу рака.

Засынаюць палеткі і нівы,
Ноч накрыла вуаллю зямлю.
Я пад гукі крынічкі руплівай
Песні ночы ў далоні лаўлю.

Аж да самага, пэўна, світання
Буду крочыць па роснай траве.
Назіраць, як чароўнае ранне
У брыльянтах расы ажыве.

Я хачу цяпло першага промня
З прахалодай начною злавіць.
Матылькоў у нябесным бяздонні
Песняй светлай ураз ажывіць.

Я хачу ажывіць нежывое...
Няхай стане зямля прыгажэй!
Бо жыццё – гэта нешта святое,
Бо жыццё за усё даражэй.

БЕЗ ВЕСТКІ

Ён з вайны не вяртаўся дахаты
Ні зімой, ні вясною, ні летам.
А сям”я так чакала салдата
І надзеяй жыла яна гэтай.
Маці пісьмы да сэрца туліла
І малітвы шаптала ўночы.
Аб адным яна толькі прасіла:
Каб убачыць сыночкавы вочы.

Спаліла вайна далягляд,
Зязюля злічыла гады.
З вайны не вярнуўся салдат
У родную вёску Дуды.

Час ішоў. Састарэлая хата
У зямельку памалу ўрастала.
Маці сына-сыночка - салдата,
Каля крыжа, ля вёскі, чакала.
А над Віслаю месяц двухрогі
Абмываўся крывавай вадою.
І суровыя сцежкі-дарогі
У бяссмерце вялі за сабою.

Сінее блакіт васількоў
І звоняць набатам званы:
Чакаюць матулі сыноў –
Без весткі прапалі яны.

СПАЛЕНАЯ ВЁСКА

Па-над спаленай вёскай закружылі буслы,
Па-над спаленай вёскай не змаўкаюць званы.
У рамонках бялюткіх расцвіла сенажаць,
Каля хатаў бетонных тры бярозкі стаяць.

Тры бярозкі схілілі верхавіны свае:
Ім чацвёртай сяброўкі на зямлі не стае.
І над спаленай вёскай анямелі буслы…
Не званіце, званы! Не званіце, званы!

У знямелым маўчанні кружаць, кружаць буслы.
Па-над вечным агнём, па-над рэхам вайны,
Аблятаючы памяць чорна-шэрым гранітам,
Тут ніхто не забыты і нішто не забыта.

А над спаленай вёскай водар лета плыве,
Супраць войнаў на свеце ён змагацца заве.
І ніколі-ніколі тут не змоўкнуць званы:
Нам не трэба вайны! Нам не трэба вайны!

СПОВЕДЗЬ

Кладуцца цені ад слупоў дарожных,
На небе Месяц блудзіць, як мядзведзь…
Сустрэўся мне старэнькі падарожны,
Што па гасцінцы рухаўся ледзь-ледзь.

Змарыўся ён ад непасільнай працы,
Не меркаваў пражыць ён долі дзве…
Сустрэчнаму,нават, магло падацца,
Што па зямлі ён не ідзе – плыве.

Ён затрымаўся ў блуканні дзённым.
Куды ішоў? Па што? Ці ведаў сам…
Ды толькі мне пра хлеб пра свой надзённы,
Прысеўшы ўзбоч дарогі, расказаў:

-Жыву адзін, як бачыш, у знямозе.
Здаецца, маладым зусім не быў,
Пакінуты ўсімі на дарозе,
Прыстанку ў Бога для сябе прасіў.

А ён усё на потым адкладае,
Здаецца, і яму не да мяне.
Напэўна кожнага ў канцы пытае,
Ці правільна пражыў жыццё, ці не?

Усё жыццё я працаваў заўзята,
А колькі бед мне лёс наканаваў!
Хоць ад дзяцей звінела мая хата,
Я жонку вельмі рана пахаваў.

Бяда адна ў хату не прыходзіць.
Не стала меншых… Як я шкадаваў!
Старэйшых не аддаў, як кажуць у народзе,
На хлеб казённы. Сам іх гадаваў.

Стараўся, каб сірочая слязінка
Не падала ні ўранку, ні ўначы.
Хацеў усё ж, каб родная сцяжынка
Вяла дахаты – бацьку памагчы.

Усіх жа вывучыў, былі абновы,
Машыны і кватэры ім прыдбаў.
Ды зразумеў, што ў іх багаж жыццёвы
Галоўнага – сумлення не паклаў.

Стаў непатрэбны я ў роднай хаце,
На новы што “пакроена” манер.
Мяне і бацькам перасталі звацi,
Як падпісаў важнейшых шмат папер.

І змоўк стары, паправіў шлейку ранца
І ад начлегу адказаўся ён.
Падняўся і пайшоў, каб не здавацца,
Шукаць свой, пэўна, вечны бастыён.

ВАЛЬС ПАД ДАЖДЖОМ

Развітальны вакзал…
Ты застаўся маёй пажыццёвай песняй.
Даруй…

Жоўтая восень у вальсе плыве,
Вецер зрывае ўспаміны мае.
Там, за акном, вальс пад дажджом.
Ён у жыццё маё ўвайшоў –
Вальс пад дажджом.

Пад дажджом вальс плыве,
Кружыць вальс, кліча – заве
Нас дваіх, толькі нас.
Мы з табой танцуем зноў.
Ты вярнуўся, ты прыйшоў –
Гэта самы шчаслівы мой час.

Нашы далоні – восені песні.
Вальсам каханне хай уваскрэсне.
Слёзы і дождж там, за акном,
Гэта да нас успамінам прыйшоў
Вальс пад дажджом.

Жоўтая восень сэрцы кранае,
Вальсам каханне нас пааднае.
Там, за акном, мы пад дажджом.
Ты да мяне назаўсёды прыйшоў
Вальсам-дажджом.

Я ДА ЦЯБЕ ІШЛА

Я да цябе ішла праз сотні вадападаў,
Праз тысячы вятроў, мільёнамі дарог.
Я да цябе ішла, хоць снег на след твой падаў,
Сцяжынку замятаў, каханне не бярог.

Я да цябе ішла праз веснавыя воды,
Агнямі незапаленых спатканняў.
Я да цябе ішла, і нават перашкоды
Не патушылі ў душы агонь кахання.

Я да цябе ішла – нямела наваколле,
Хавала ад мяне маю тугу.
Я да цябе ішла, хоць ведала: ніколі
Табе прызнацца ў каханні не змагу.

Я да цябе ішла…

ПРЫЗНАННЕ

Улетку мне без вас так сумна,
Мае Наташы, Сашы, Вані.
І ў вераснёўскі ранак шумны
Да вас спяшаю на спатканне.

Спяшаю побач быць заўсёды,
Дабру і грамаце вучыць,
Вучыць адольваць перашкоды
І на зямлі сумленна жыць,

Дапамагаць расці і верыць,
Дыханне часу адчуваць.
Бо мне без вашага даверу
Ніяк Настаўніцай не стаць.

***

“Хвала рукам, што пахнуць хлебам”,
Але ж яны шчэ пахнуць потам,
Спякотным сонцам, хмарным небам,
Надзеяю на лепшае, на потым.

Так кожны дзень, не ведаючы стомы,
Не падзяляючы на будні і на святы,
Працуюць рукі – казачныя гномы,
Працуюць шчыра і заўзята.

А маюць што? Крывавыя мазолі,
Стаптаныя абцасы кірза-ботаў
І ўсё ж чакаюць лепшай долі,
І спадзяюцца ўсё ж на потым.

“Хвала рукам, што пахнуць хлебам!”
Назваць хачу іх залатымі.
Бо на зямлі, пад родным небам,
Яны заўжды будуць святымі.

НЕ ПАКІНЬ

Зазвініць каласамі збожжа,
Заспявае палетак родны.
Вецер хвалі рукой асцярожна
На калоссе кіне лагодна.

І нябёсы загады з высі
На зямлю прынясуць: пачынай!
Да штурвала рукі ўзняліся,
Ну давай, хлебароб, давай!

Зерне к зернетку – важкі колас,
Зерне к зернетку – хлеба плынь.
І плыве па-над ніваю голас:
– Не пакінь! Не пакінь! Не пакінь!

– Не пакінь каласок у полі, –
Васілёк прашаптаў на мяжы. –
– Бо без хлеба не будзе долі,
Бо без хлеба не будзе душы.

– Не пакінь, – кажуць сонейка, неба, –
Хай вясной каласок уваскрэсне,
Бо не будзе песні без хлеба,
Ды і хлеба не будзе без песні.

****

Уладзіміру Мулявіну

Песняру беларускай зямлі
Я мелодыю сэрца аддам
І на зорку, што ён запаліў,
Буду вечна маліцца багам.

Усявышні – даруй, Усявышні – ўратуй
Нашы сэрцы ад ганьбы і згіну,
Звон крыніц і лясоў беларускіх пачуй –
Зразумееш: ён нас не пакінуў!

На жыццёвым крутым віражы
Запаліў Беларусі святло
І пранёс на уласным крыжы,
Каб ніколі не згасла яно.

Я іду, цераз памяць і боль,
Пад узмахам буслова крыла,
А са мной да Радзімы любоў,
Да зямлі, што яго прыняла.

НЕ СПІЦЦА

Даруйце, любы, мне не спіцца,
Глухая восень за акном.
А спадзяюся, што прысніцца
Наш той апошні першы гром.

Не спіцца, не спіцца…
Маланка, неба рассячы.
А я Вам так хачу прысніцца,
Я так хачу табе прысніцца
І больш ад Вас не ўцячы
У майскі гром тае начы.

Даруйце, любы, што не спіцца,
Я дождж з грымотамі лаўлю.
А каб магла я Вам прысніцца,
То не змаўчала б, што люблю.

Даруйце, любы, Вам ці спіцца?
Каханне спалена агнём…
Хай Вам ніколі не прысніцца
Наш той апошні першы гром.

****

Жонкам пажарных,
загінуўшых на Чарнобыльскай АЭС

Быў Чарнобыль. Было балюча.
Мора смерці было, агню...
Ты праз атам смяротна-калючы
Не вярнуўся ка мне ўпершыню.

Я чакала цябе на світанні
І чакаю. Не год і не два.
Мне рамонкі варожаць спатканне,
А цябе ўсё няма і няма.

Я шукаю твае сцяжынкі,
Я шукаю твае сляды.
У далоні лаўлю дажджынкі,
Нібы лекі ад чорнай бяды.

Як агонь легендарнага Данка,
Тваё сэрца накрыла бяду.
Да цябе, на апошні паўстанак,
Чорны боль у рамонках кладу.

Быў Чарнобыль. Было балюча.
Мора смерці было, агню...
Ты праз атам смяротна-калючы
Толькі ў памяць прыходзіш маю.

***

Заблуджуся аднойчы ў жнівеньскіх росах,
Стану кропелькай дробнай сівых туманоў,
Паплыву па няскошаных травах, пракосах,
Уздымуся на хвалю царкоўных званоў,
Падымуся туды, дзе бязмежжа і ціша,
Дзе пануе святочнасць надзей і высноў,
Дзе нябёсаў фіранку вецер марай калыша,
Запаліўшы ў небе мільярд ліхтароў.
Як знайсці мне ліхтар – той адзін, той адзіны,
Каб у лютую сцюжу мяне абагрэў,
Каб цяплом растапіў безвыходнасці льдзіны,
Што зямлю акружылі. Ды каб сам не згарэў…

ВЫТОКІ

Сяброўкам дзяцінства
Аліне і Станіславе

Навошта хата, калі ёсць кватэра.
Навошта вёска? У горадзе жыву.
Ды толькі ў снах (і веру, і не веру) –
У снах прыходзіць вёска, быццам наяву.

Радзіма там мая. Мне луг і поле сніцца,
Маліннік каля хаты, ля майго акна,
Алешына над рэчкай, а пад ёй – крыніца,
Салоўка плача там, спявае давідна.

Матулі кросны сняцца мне ў хаце,
Нефарбаваная падлога-палатно.
Снапы на полі, як чыны высокай знаці,
І валачобнікі ў Вялікдзень пад акном.

Шчэ сню крыжы на могілках сівыя,
Туды сышлі вяскоўцы спачываць.
Ды сніцца вецер, што жалобна ноччу вые
І рвецца з коміна на поплаў-сенажаць.

Навошта горад, калі вёска сніцца,
І будзе сніцца, пакуль я жыву.
Шкада, што памяці маёй крыніца
Вітанне ў снах ёй шле. І зрэдку – наяву.

ПЕРШЫЯ СНЯЖЫНКІ

Першыя сняжынкі ў паветры кружаць,
Хмарай белай холад к нам плыве здаля.
Добры дзень, снег першы, мой зімовы дружа!
Добры дзень, зімовая, белая зямля!

Супыніся, вецер, супакойся, вецер,
Дай крануць бялюткі снегавы шацёр.
Не гайдай шалёна трапяткое вецце,
Музыкай чароўнай абудзі прастор.

Сустракай сняжынкі, поле і дубровы!
Першынцу далоні, рэчка, працягні!
Глянь, убор бялюткі – чысты, светлы, новы –
Так ідзе да твару матухне-зямлі.

****

Ніне Іванаўне Банцарэвіч

Мне сніўся сёння ранак вераснёўскі,
Нібы баяна спеўны гукарад...
У рукі сшытак узяла вучнёўскі,
Ўзяла яго, як трыццаць год назад.

У памяці ўсплыло да болю дарагое,
Святое, чым жыла я ўсе гады.
Даўно саспела рунь, пасеяная мною,
Мой першы выпускнік ужо немалады.

Цяпло душы сваёй на ўсіх дзяліла,
Ўсе моры, акіяны разам праплылі.
А выпраўляючы у свет, заўжды маліла
Знайсці сябе, каб не згубіцца на зямлі.

Мне сніўся сёння вераснёўскі ранак,
І сон мне той утойваць не з рукі:
Бо на высокі родны школьны ганак
Мне клалі кветкі ўсе выпускнікі.

***

З бяроз упалі першыя лісты,
Заплакала на развітанне лета.
Я ведаю: са мной не будзеш ты,
Я ведаю: мая ўжо песня спета.

Якой была мелодыя твая?
Мая душа тваёй душы хацела.
Але даруй, парвалася струна,
Звязаць яе я так і не сумела.

Бо песня ў нябёсы паплыла,
Вярнулася ўжо з крыкам жураўліным…
А мо яна і песняй не была,
А толькі пошчакам была буслiным?

АПОШНЯЯ СУСТРЭЧА

Мялі снягі, стагнала завіруха,
Нямеў прастор ад холаду зімы
І аканіцы за сцяной рыпелі глуха...
У тым бязлюддзі зноў сышліся мы.

Свяціў у небе месяц. А сузор'і
Нас не змаглі сагрэць ужо сабой.
Пад тым святым, нямым шматслоўем
Мая душа спрачалася з табой.

Яна твае лавіла апраўданні,
Ды апраўдаць усё-ткі не змагла.
Ужо і месяц павярнуў на ранне,
Шкадуючы апошняга святла.

А мы стаялі моўчкі. Усё маўчала.
Нямеў прастор ад холаду зімы.
А я цябе ад сэрца адрывала...
У тым бязлюддзі не сышліся мы.

СОНЦА І МЕСЯЦ
Байка

Сустрэла Сонца Месяц ясны,
Спытала:
– Ты чаму няшчасны?
Чаму не спіш? Чаго блукаеш?
Хіба прытулку ты не маеш?
Ды не спяшаўся Месяц ясны
Даваць адказ, чаму няшчасны,
Чаму не спіць, чаго блукае,
Чаму прытулку ён не мае.
Бо і не думаў Месяц ясны
Лічыць сябе такім няшчасным.
Яму здавалася, што Сонца
Няшчасна спёкаю бясконцай:
Спякотай дзённаю блукае,
Схавацца пэўна ў цень жадае.

Як зразумець, хто з іх няшчасны –
Ці Сонца шар, ці Месяц ясны?
Не чуеш спёку ў сваім воку –
А лепш відаць усё, што збоку.

***

Чаму грукоча гром, скажы,
Палошча жнівень хмары?
…То распінае на крыжы
Ўсявышні мае мары…

***

Папонаю пакрыты конскі круп,
Спацела-стомлены і мокра-слізкі…
Для адпачынку конь прывязаны за слуп –
Відаць, пераадолеў шлях зусім няблізкі.

Так кожны з нас вязе цяжкі свой воз,
І кожнаму свая пазначана дарога.
На ёй бывае горка аж да слёз…
Чаму ж толькі тады звяртаемся да Бога?

МАЛІТВА

Надзялі мяне, Божа, дабрадзейнаю сілай,
Каб яе ў сваім сэрцы ўсё жыццё я насіла,
Каб яна памагала сустракаць мне світанні
І надзею давала на любоў і каханне.

Не пакінь мяне, Божа, у душэўнай знямозе
І не дай разгубіцца на жыццёвай дарозе.
Дай здароўя, прашу, ты і дзецям і ўнукам,
Каб ад працы ў іх не стамляліся рукі.

Уратуй мяне, Божа, ад жыцця на чужыне,
Хоць туды, спадзяюся, мяне лёс не закіне.
Надзялі мяне, Божа, і пяшчотай, і ласкай,
Не дазволь ты мне страціць пажыццёвую казку.

Надзялі мяне, Божа, дабрадзейнаю сілай,
Каб яе ў сваім сэрцы ўсё жыццё я насіла.
Каб яе ў сваім сэрцы ўсё жыццё я насіла,
Надзялі мяне, Божа, цудадзейнаю сілай.

***

Нам хочацца зімой дажджоў вясновых
І шэпту мяккай маладой травы.
Бярозы мрояцца ў сарафанах новых,
Снягоў гамонка ў ручаях жывых.
Але ўсяму пара свая прыходзіць:
Мяняюцца пейзажы ў жыцці.
То скачуць весела ў вясновым карагодзе,
То скачуць моўчкі ў зімовым забыцці.
Адно нязменным застаецца ў прыродзе:
Дарога ўперад – той адзіны край...
Так хочацца,каб на апошнім пераходзе
Свяціла стрэлка з указальнікам “У РАЙ”

***

Праз гады я ішла
І прыйшла да сягонняшняй хвілі.
Як умела, жыла,
Адмярала жыццёвыя мілі.
Прыдарожных слупоў
І калючых дратоў не лічыла.
Пастаянная ў сэрцы любоў
Прыдавала мне сілы.
Я любіла усё,
На што зрок адкрываў таямніцы:
Маю вёску, і лес,
І гамонку бурлівай крыніцы.
А яшчэ тых людзей,
З кім жыццё мне дарыла спатканні,
Сярод мора надзей
Безліч розных сустрэч – не расстанняў...

МАМЕ

Затулі мяне ў росныя ранкі,
Кінь на плечы світальны туман.
Сустракай мяне, мама, на ганку –
Толькі ты зразумееш мой стан.

Ты адна мне надзею падорыш,
Забярэш палавіну турбот,
Дапаможаш у радасці, горы,
Выйсце ўкажаш з жыццёвых нягод.

Ты, як зорка, што шлях асвятляе,
Нібы рэчка, што кліча ўдаль.
Тваё слова ў жыцці акрыляе,
Сэрца – ветразь на грэбені хваль.

Затулі мяне ў росныя ранкі,
Кінь на плечы світальны туман.
Сустракай мяне, мама, на ганку –
Толькі ты зразумееш мой стан.

МАЙМУ БРАТУ

Нябёсы пра цябе яшчэ не дыктавалі,
І Муза з высі да мяне не йшла.
З чаго свой шлях жыццёвы пачыналі? –
З бясконцых пахаванняў, а не са святла.

У моры слёз і непаразуменняў
Наканавана жыць ды шчэ спяваць…
Табе – калекам аддаваць уменне,
Мне – холад душ радкамі саграваць.

Паміж сабою жыць у згодзе і з матуляй
(Сумелі ж выхаваць нас так бацькі).
Нас і хрысцілі ў адной кашулі –
На згоду йдзе павер’е праз вякі.

НА НОВАЙ ЗЯМЛІ
(*урывак з паэмы*)

Красу свайго зямнога раю
Я ні на што не прамяняю.
Мне любы спеў крыніц імклівых,
Усмешак ветлівых, шчаслівых,
Блакіт пралесак у гаі,
Дзе так спяваюць салаўі.
Кранае сэрца пах вясновы,
Калі мяняюць на абновы,
Бярозы белы сарафан,
А дуб стаіць нібыта пан
Ў маўклівым ціхім задуменні.
Ён скіраваў сваё карэнне
Углыб, да самых да крыніц
І не баіцца навальніц.
Бо што яму тыя грымоты?!
Асілак ён, а не блазнота.
Асілак, як і мой народ,
Што шмат адолеў перашкод.
Не вельмі гнуўся ён ад ветру:
Апору меў – зямныя нетры.
Хто на зямлі стаіць трывала,
Таму не страшна і навала.

ПЕРАКЛАДЫ

Аляксандр ПУШКІН

****

Узвёў я помнік для сябе нерукатворны,
Народнай сцежцы зарасці не дасць журба,
Вышэй узнёсся галавой ён непакорнай
Александрыйскага слупа.

Не, ўвесь я не памру – бо ліра ў запавеце
Мой прах перажыве душа і тлен збяжыць –
І слаўны буду я, пакуль на гэтым свеце
Пііт адзін хоць будзе жыць.

Слых пройдзе аба мне па ўсёй Русі вялікай,
І назаве мяне ўсяк існы ў ёй народ,
І горды ўнук славян, і фін, і зараз дзікі
Тунгус, калмыцкіх стэпаў род.

І доўга буду тым прыязны я народу,
Пачуцці добрыя што лірай прабуджаў,
Што ў жорсткі век мой праслаўляў і я Свабоду,
Да паўшых літасць прызываў.

Наказу божаму, будзь паслухмянай, муза,
Не бойся крыўды і не патрабуй вянка;
Паклёп і пахвалу спакойна ты адужай
І не аспрэчвай дурака.

***

Я вас кахаў: каханне шчэ, быць можа
Ў душы маёй пагасла не зусім;
Няхай яно вас больш не патрывожа;
Я засмучаць вас не хачу нічым.

Кахаў я моўчкі вас, кахаў самотна,
Нясмела, баязліва і з тугой;
Я вас кахаў так шчыра, так пяшчотна,
Каханай вам другім не быць такой.

НЯНЬЦЫ

Сяброўка дзён маіх суровых,
Ты для мяне нібы святло!
Адна ў глушы лясоў сасновых
Чакаеш ты мяне даўно.
Ты пад акном сваім нячутна
Гаруеш, быццам на часах,
Пруткі марудзяць памінутна
У зморшчаных тваіх руках.
Ты ў забытыя вароты
Глядзіш на чорны дальні шлях;
Твая напоўнена істота
Журбой штохвільнай у грудзях.
Табе здаецца ўсё…

***

Я помню дзіўнае імгненне:
Паўстала ты перада мной,
Як мімалётнае ўяўленне,
Красы як геній незямной.

У муках суму безнадзейных,
Ў трывогах шумнай мітусні
Гучаў мне доўга голас спеўны
І рысы мілыя я сніў.

Ішлі гады. Ў мяцежных бурах
Згубіў парыў ранейшых мар,
Забыўся я ў жыцця віхурах
Чароўны твой нябесны твар.

Ў глушы, у змроку, без збавення
Знікалі ціха мае дні
Без бажаства, і без натхнення,
Без слёз, жыцця, і без любві.

Душы настала прабуджэнне:
Ты зноў паўстала прада мной,
Як мімалётнае ўяўленне,
Красы як геній незямной.

І сэрца б'ецца ў захапленні,
І для яго ўваскрэслі зноў
І бажаство, сляза натхнення,
Жыццё, каханне і любоў.

ЗІМНІ ВЕЧАР

Бура мглою неба крые,
Круціць снежныя віхры,
То, як звер, яна завые,
То заплача ў двары;
То па даху спарахнелым
Зашуміць саломай ўраз,
То вандроўнікам спазнелым
Стукне ў акно да нас.

Наша драхлая халупка
У маркоце, у цямне.
Ты чаго, мая галубка,
Так прыціхла пры акне?
Ці-то буры скавыценнем
Ты прытомлена адна,
Ці-то дрэмлеш пад гудзенне
Ты свайго верацяна.

Вып'ем, добрая сяброўка,
Ў маладосці мы бядней,
Вып'ем з гора; кубкам – лоўка?
Сэрцу будзе весялей.
Спей мне песні, як сініца
За марамі дзесь жыла;
Як дзяўчына-маладзіца,
Па ваду ўранні йшла.

Бура мглою неба крые,
Круціць снежныя віхры,
То, як звер, яна завые,
То заплача ў двары.
Вып’ем, добрая сяброўка,
Ў маладосці мы бядней,
Вып’ем з гора; кубкам – лоўка?
Сэрцу будзе весялей.

ВЯЗЕНЬ

За краты патрапіў турмы я сырой.
І вырас арлом у няволі самой,
Мой сумны таварыш махае крылом,
Крывавую ежу клюе пад акном,

Клюе і кідае, глядзіць у акно,
Як быццам са мною задумаў адно;
Мяне кліча поглядам, крыкам сваім
І вымавіць хоча: “Давай паляцім!

Мы вольныя птушкі; пара, брат, пара!
Туды, дзе за хмарай бялее гара,
Туды, лзе знікаюць марскія краі,
Туды, дзе гуляць можна з ветрам… дваім…”

Сяргей ЯСЕНІН

ПУШКІНУ

Я мару аб магутным дары
Таго, хто рускім лёсам стаў,
Стаю я на Твярскім бульвары
І размаўляць з сабой пачаў.

Бландзіністы, амаль бялесы,
Стаў у легендах, як туман,
О Аляксандр! Ты быў гарэза,
Як я сягоння хуліган.

Ды тыя мілыя забавы
Не зацямнілі вобраз твой,
І ў бронзе выкаванай славы
Трасеш ты гордай галавой.

А я стаю, як прад прычасцем,
І гавару табе ў адказ:
- Памёр бы зараз я ад шчасця,
Каб тое ж перажыць хоць раз.

Але, адданы на ганенне,
Яшчэ я доўга буду пець…
Каб і маё ўсё ж песнапенне
Сумела бронзай празвінець.

САБАКУ КАЧАЛАВА

Дай, Джым, на сшчасце лапу мне,
Такую лапу я нябачыў зроду.
Пабрэшам мы пры месяца святле
На ціхае надвор’е ці пагоду,
Дай, Джым, на шчасце лапу мне.

Мяне ты, калі ласка, не ліжы,
Не разумееш ты мяне ўпарта.
Хіба ты знаеш, што такое жыць,
Не ведаеш, што жыць на свеце варта.

Твой міла-знакаміты гаспадар
Гасцей у сваім доме вельмі шмат збірае,
Атрымлівае кожны, нібы дар,
Дазвол, калі ён поўсць тваю чапае.

Прыгажуном ты па-сабачы стаў,
З такою мілаю даверлівай прыятцай.
Нікога ты ні кроплі не спытаў,
Як п’яны сябар лезеш цалавацца

Мой мілы, Джым, сярод гасцей тваіх
Было ўсялякіх, пэўна, там нямала.
А тая, што была сціплей за ўсіх,
Сюды яна, выпадкам, не трапляла?

Чакай, што прыйдзе, я даю парукі.
Няхай жа зловіць твой пагляд яна,
Ты з ласкай за мяне лізні ёй рукі
За ўсё, у чым прад ёй мая віна.

ЛІСТ ДА МАЦІ

Ты, мая старэнькая, жывая?
Прывітанне шлю табе сваё!
Хай ніколі толькі не згарае
Невымоўнае святло тваё.

Пішуць мне, што тоіш ты трывогу,
І сумуеш вельмі аба мне,
Што ты часта ходзіш на дарогу
Ў старамодным драхлым шушуне.

І табе ў вячэрнім сінім змроку
Часта бачыцца адно ўсё ж:
Нібы ў кабаку ў час бойкі ,збоку,
Хтосьці гваздануў мне ў сэрца нож.

Родная, нічога! Супакойся.
Цяжкая лухта душу скрабе.
Не такі ўжо горкі я прапойца,
Каб сысці, не ўбачыўшы цябе.

Як раней, я ўсё такі ж пяшчотны,
Свае мары сабяру ў ком,
Ад тугі мяцежнай і самотнай
Мне б вярнуцца ў нізенькі наш дом.

Я вярнуся, як раскіне голле
Па-вясноваму наш белы сад.
На світанні ты мяне ўжо болей
Не будзі, як восем год назад.

Не будзі таго , што ў летуценні,
Не хвалюй таго, што ў забыцці –
Страту раннюю і змору не ад ценю
Мне прыйшлося зведаць у жыцці.

І маліцца не вучы мяне. Я з грэхам!
Больш няма вяртання ўжо назад.
Дапамога ты мне і ўцеха,
І святло, якому я так рад.

Дык забудзь жа пра сваю трывогу,
Не сумуй ты вельмі аба мне,
Не хадзі так часта на дарогу
Ў старамодным драхлым шушуне.

***

Шаганэ ты мая, Шаганэ!
Мо таму, што я з поўначы болей,
Я гатоў расказаць табе поле,
Хвалі жыта ў нябесным святле,
Шаганэ ты мая, Шаганэ.

Мо таму, што я з поўначы болей,
Месяц большы там, пэўна, ў сто раз,
Прыгажун хоць такі Шыраз,
Ён не лепей разанскіх раздолляў.
Мо таму, што я з поўначы болей.

Я гатоў расказаць табе поле,
У жытоў я ўзяў валасы,
Хочаш, іх ты на палец вяжы –
Я адчуць не магу нават болю.
Я гатоў расказаць табе поле.

Хвалі жыта ў нябесным святле –
У мае кучары, ты здагадайся.
Дарагая, жартуй, усміхайся,
Не будзі толькі ў памяці мне
Хвалі жыта ў нябесным святле.

Шаганэ ты мая, Шаганэ!
Там дзяўчына на поўначы дзесьці,
Яе воблік з тваім можна звесці,
Можа, думае аба мне…
Шаганэ ты мая, Шаганэ!

***

Не шкада, не клічу і не плачу,
Пройдзе ўсё, як з белых яблынь дым.
Завяданнем золата “охваченный”
Я не буду болей маладым.

Ты цяпер не гэтак будзеш біцца
Сэрца, нібы ў ім халодны нож,
І паркаль бярозаў будзе сніцца,
Швэндацца не зманіць басанож.

Ўсё радзейшы, дух ты валацужны,
Вуснаў расшавельваеш агонь.
Будзь растрачаная свежасць мужнай,
Пакладзі пачуцці на далонь.

Я цяпер скупым стаў у жаданнях,
Можа, я цябе, жыццё, прысніў?
Быццам я вясновым гулкім раннем
На ружовым праскакаў кані?

ўсе мы, ўсе мы ў гэтым свеце тленным,
Ціха льецца з клёнаў медзь лістоў…
Будзь жа ты навек благаславенным,
Што цвісці і памярці гатоў.

Іван КРЫЛОЎ

СВІННЯ ПАД ДУБАМ

Свіння пад дубам векавым
Паела жалудоў дасыта, да адвала;
Паеўшы, спаць лягла пад ім;
Пасля, прадраўшы вочы, ўстала
І рылам падрываць карэнне ў дуба стала.
“У гэтым дрэву шкода ёсць, –
Сказаў ёй з Дубу воран-госць, –
Аголіш карані, яно засохнуць можа.” –
“Хай сохне, – кажа так Свіння, –
Мяне ўжо гэта не трывожа;
Карысці мала бачу я;
Хоць век яго не будзе, я не пашкадую,
Былі бы жалуды: бо імі я жырую,” –
“Няўдзячная! – ёй кажа Дуб, – ты мусіш чуць:
Калі б уверх магла падняць ты рыла,
То для сябе б адкрыла,
Што тыя жалуды на мне растуць.”

_____

І невук так у асляпленні
Навуку лае і вучэнне,
Адчуць не можа праз гады,
Што ў працы ад навукі зазнае плады.

ВОЎК І ЯГНЯ

Бяссільны вінаваты ў моцнага заўжды:
Таму ў Гісторыі мы прыкладаў шмат чуем,
І хоць яе мы і трактуем,
Ды толькі ў Байках ёсць свае хады.

———————

Ягня прыйшло ў гарачы дзень вады напіцца;
І трэба ж той бядзе звaліцца,
Што шныраваў ля тых мясцін галодны Воўк.
Ягня ўбачыў ён, здабыць яго імчыцца;
Каб справе даць законны хоць бы выгляд, толк,
Крычыць: “Як смееш ты, нахабнік, брудным рылам
Тут чыстае муціць піццё
Маё
З пяском і з ілам?
Я дзёрзкасць не прыму
І галаву з цябе здыму.” –
“Святлейшы Воўк каб мог дазнацца,
Асмелюся данесці, што па ручаю,
Ад светласці яго ніжэй на шмат я п’ю;
Дарэмна хоча ён усё ж злавацца:
Піццё муціць яму ніяк я не магу.” –
“Пагэтаму я лгу!
Нягодны! слыць дзёрзкасці такія ў свеце!
Ды помніцца, што ты яшчэ ў запрошлым леце
Мне тут жа неяк нагрубіў:
Я гэтага, прыяцель, не забыў!” –

“Памілуй, мне і ад роду няма шчэ году.” –
Ягнятка кажа так: “Дык гэта быў твой брат.” –
“Няма іх у мяне.” – “Дык гэта кум ці сват
І, словам, нехта з вашага такі ўсё ж роду.” –
Сабакі вашы, вы і вашы пастухі,
Вы хочаце мне ліха,
І з вамі ў мяне заўжды неразбярыха.
Я расквітаюся з табой за іх грахі.” –
“Ах, я віноўны чым?” – “маўчы! Лухту
не плесці.
Забава разбіраць віны твае, малок!
Ты вінаваты тым, што хочацца мне есці.”
Сказаў і ў цёмны лес Ягнятка павалок.

ЛІСІЦА І ВІНАГРАД

Галодная кума Ліса залезла ў сад;
Там рдзелі гронкі вінаграду.
Гарэць у кумкі вочы сталі, зубы рады,
А гронкі сочныя як яхантаў парад;
Ды вось бяда, вісяць яны высока:
Жаданне браць душу Лісы дзярэ,
Хоць бачыць вока,
Зуб не бярэ.
Дарэмна страціла гадзіну,
Пайшла і кажа з прыкрасцю яна: “Ну дзе ж!
На погляд ён хоць еш,
Зялёны – спелай ні адзінай:
Аскому зараз жа наб’еш.”

ВАРОНА І ЛІСІЦА

Так шмат разоў сцвярджалі свету,
Што шкодная ліслівасць, толькі ўсё
не ўтолк,
Ліслівец знойдзе ўсё ж у сэрцы вугалок.

_____

Вароне дзесьці бог паслаў сыр, меў на гэта мэту;
На елку села птушка ўмах,
Паснедаць ёй было зусім ужо не страх,
Ды ўсё ж сумелася, а ў роце сыр трымала.
На тое ліха там лісіца прабягала;
Раптоўна сырны пах Лісу спыніў;
Лісіца бачыць сыр, Лісу ён паланіў,
На дыбачках махлярка стала падыходзіць,
Круціць хвастом, з Вароны воч не зводзіць
І кажа соладка ёй так сама:
“Глядзішся добра ты, кума!
Ну што за шыйка, што за вочкі!
Расказваць казкі перад ночкай!
Якое пер’е! І які насок!
Ангельскі быць павінен, пэўна, галасок!
Спей, сонца, не саромся! Можа, ты, сястрыца,
Пры харастве такім спяваць яшчэ майстрыца, –
Цар-птушкай нам магла б згадзіцца! ”
Хвала вяшчункіна ў галаву дала,
Дыханне ў валяку ад шчасця спёрла. –
Лісіцы мова ветлівай была –
Варона каркнула ўсім варонім горлам:
Сыр выпаў – з ім махлярка прэч адсюль сышла.

СТРАКАЗА І МУРАШКА

Непаседа Страказа
Лета звонкае прапела;
Азірнуцца не паспела,
Як зіма ідзе назад.
Памярцвела чыста поле;
Дзён няма тых светлых болей,
Як пад кожным ёй лістком
Быў гатовы стол і дом.
Ўсё прайшло: з зімой халоднай
Беднасць, голад настае
Страказа ўжо не пяе;
Нават думак не стае
Пець на страўнік свой галодны!
Злая, сумная адна
Да Мурашкі йдзе яна:
“Не пакінь ты кумкі мілай!
Дай ты мне сабрацца з сілай
Да вясновых дзён ці дней
Пракармі і абагрэй!” –
“Кумачка, мне дзіўна гэта:
Працавала ты ці ўлета? –
Чуць адказ такі цяжэй.
“Ці ж была, галубка, сіла?
Ў мяккіх муравах у нас
Песні, жвавасць увесь час,
Галаву аж закруціла,” –
“А, дык ты…” – “Я без душы
Праспявала ўсё лета.” –
“Ты ўсё пела? Справа гэта:
Дык ідзі скачы-пляшы!”

КВАРТЭТ

Свавольніца Мартышка,
Асёл,
Казёл
Ды касалапы Мішка
Задумалі сыграць Квартэт.
Дасталі нот, басы, альты, дзве скрыпкі
І селі на лужок пад ліпкі, –
Мастацтвам свет каб захапляць.
Ударылі ў смычкі, а толку не чуваць.
“Стой, братцы, стой! – крычыць Мартышка –

Пачакайце!
Як музыцы ісці? Вы правІльней сядайце.
Ты з басам, Мішачка, сядай супраць альта,
Я, прыма, супраць сяду “Ўторы”;
Тады ўжо пойдзе музыка не так:
У нас заскачуць лес і горы!”
Паселі, пачалі Квартэт;
Ён ўсё-такі на лад няйдзе.
“Пастойце ж, я знайшоў сакрэт! –
Крычыць Асёл, – напэўна, мы паладзім,
Як побач сядзем.”
Паслухалі Асла: паселі стройна ў рад;
А ўсё-такі Квартэт няйдзе на лад.
Вось больш ранейшага ў іх пайшлі разборы
І “споры”
Каму і як сядзець.
І трэба ж Салаўю на шум іх прыляцець.
Ўсе з просьбай да яго, каб іх рашыць сумненне.

“Бадай што, – кажуць, – ты вазьмі крыху цярпення,
Змяні ты ў Квартэце нашым штось:
І ноты ёсць у нас, і інструменты ёсць,
Мо кожны сеў як госць?” –
“Каб музыкантам быць,патрэбна ўсё ж уменне.
І вушы вашых ласкавей, –
Дае адказ ім Салавей, –
А вы, сябры, як ні сядайце,
Ў музЫкі лепей не трапляйце.”

Міхаіл ЛЕРМАНТАЎ

СМЕРЦЬ ПАЭТА

Адплаты, гасудар, адплаты!
Паду да ног тваіх:
Будзь справядлівы, пакарай забойцу,
Каб кара ў наступныя вякі
Твой слушны суд нашчадкам абвясціла,
Каб бачылі злачынцы ў ёй прыклад.

Паэт загінуў! – і з адвагай –
Ён, абалганы чуткай, паў,
Свінец прыняў і з помсты прагай
Ён голаў з гонарам паклаў.
Не вынесла душа паэта
Няславы дробязнае крыўд,
Паўстаў ён супраць думак свету
Адзін, як перш… таму й забіт!
Забіт!.. нашто цяпер рыданні,
Пустой хвалы дарэмны хор,
Нікчэмны лепет апраўдання?
Здяйсніўся лёсу прыгавор!
Не вы спярша так злосна гналі
Яго свабодны, смелы дар
І для ўцехі раздзімалі
Крыху затоены пажар?
Што ж? весяліцеся … мучэнні
Апошнія былі, як рок:
Пагас, як светач, дзіўны геній,
Завяў святочнасці вянок,

Яго забойца так спакойна
Навёў удар… нібы ў свет:
Пустое сэрца б’ецца роўна,
Ў руцэ не ўздрыгнуў пісталет,
І што за дзіва?... быццам босы,
Такі, як сотні беглякоў,
На лоўлю шчасця і чыноў
Закінуты к нам воляй лёсу;
Ён, смеючыся, не прымаў
Чужыя норавы і словы;
Не шкадаваў і нашай славы;
Не разумеў у міг крывавы,
На што руку ён падымаў!..

І ён забіт – і ўзят магілай
Як той спявак, вядомы ледзь, ды мілы,
Здабыча рэўнасці глухой,
Апеты ім з такою цуднай сілай
Забіты, як і ён, бязлітаснай рукой.

Нашто ад мірных ласкаў, дружбы прастадушнай
Ўступіў у гэты свет зайздросны ён і душны
Для сэрца вольнага і палкасці страсцей?
Нашто руку ён даў паклёпнікам нікчэмным,
Нашто паверыў ён тым словам, “ласкам” гнеўным,
Ён з юных год спасцігнуўшы людзей?..

Былы знялі вянок – яны вянец цярновы,
Абвіты лаўрамі надзелі на яго:
І голкі ж тайныя сурова
Ўядалі слаўнае чало;

Атручаны яго апошнія пакуты
Каварным шэптам невукаў, а не людзей,
І ён памёр – той помстаю закуты,
Са злосцю тайнаю падманутых надзей.

Замоўклі гукі цуднай песні,
Ніколі ёй больш не гучаць:
Яго пытулак хмурны, цесны,
На вуснах спевака пячаць.

А вы, пыхлівыя патомкі,
Вядомай подласцю праслаўленых бацькоў,
Пятою рабскаю папраўшыя абломкі
Ігрой шчасліваю пакрыўджаных радоў!
Вы сталі ў натоўпе прагным каля трона,
Свабоды, Генія і Славы “стукачы”!

Стаіліся вы ў засені закона,
Прад вамі суд і праўда – ўсё маўчы!..
Ды ёсць і божы суд, наперснікі распуты!
Ёсць грозны суд: ён ТАМ;
Ці ў кішэні звон, ці пуста,

Ён думкі, справы ўсе наперад знае сам.
Дарэмна звернецеся вы тады к зласлоўю:
Яно вам не паможа зноў,
І вы не змыеце ўсёй вашай чорнай кроўю
Паэта праведную кроў!

ВЕТРАЗЬ

Бялее ветразь адзінокі
Ў блакітным мора тумане!..
Шукае што ў краі далёкім?
Што ў роднай кінуў старане?..
А вецер свішча – хваля йграе,
І мачта гнецца і рыпіць…
Ды не, – ён шчасця не шукае
І не ад шчасця ён бяжыць!
Пад ім святлей блакіту просінь,
Здаецца далеч залатой…
А ён, мяцежны, буры просіць,
Нібы ў бурах ёсць спакой!

Мікалай НЯКРАСАЎ

НЯЗЖАТАЯ ПАЛАСА

Позняя восень. Гракі адляцелі.
Лес агаліўся, палі апусцелі,

Толькі не зжата палоска адна…
Смутную думу наводзіць яна.

Шэпча калоссе мо ўжо без надзеі:
“Сумна нам слухаць увосень завеі,

Сумна схіляцца да самай зямлі,
Трэба не ў пыле каб зерні былі!

Нас спусташаюць станіцы штоночы
Птушак пралётных, да зерня ахвочых,

Заяц нас топча і бура нас б’е…
Дзе ж наш араты? Чаму не ідзе?

Хіба за іншых мы горш урадзілі?
Хіба нядружна цвілі-каласілі?

Не! Мы за іншых не горш – і даўно
Зернем саспелі і мы ўсё адно.

Не для таго той араты пасеяў,
Каб нас тут вецер асенні развеяў?”

Вецер нясе ім самотны адказ:
- Хворы араты ў гэты вось час.

Браўся араць ён і сеяць з ахвотай,
Выдумаў ён не пад сілу работу.

Дрэнна нябогу – не есць і не п’е,
Хворае сэрца чарвяк яму ссе.

Рукі, барозны што вывелі тыя,
Звялі, як плёткі, і сталі сухія,

Вочы схмурнелі і голас прапаў,
Песню што некалі нудна спяваў,

Як на саху налягаў ён рукою,
Як задуменна ішоў паласою.

ТРОЙКА

Што ты прагна глядзіш на дарогу,
Убаку ад сябровак-дзяўчат?
Пэўна, сэрца забіла трывогу –
Твар успыхнуў, бы ў квецені сад.

І навошта бяжыш ты паспешна,
І за тройкай імчышся ўслед?
На цябе, рукі ўбокі, бязгрэшна,
Заглядзеўся праезджы карнет.

На цябе заглядзецца не дзіва,
Усялякі не супраць кахаць.
Чырвань стужкі тваёй жартаўліва
Ў чорных косах бы ночы падстаць.

Скрозь румянец шчакі тваёй смуглай
Прабіваецца лёгкі пушок,
І з-пад броўкі тваёй напаўкруглай
Погляд вока, як хітры звярок.

Адзін погляд чароўнай дзікункі,
Што запальвае чарамі кроў,
У старога бярэ падарункі,
Ў сэрца хлопца закіне любоў.

Пажывеш, пасвяткуеш уволю,
Будзе поўным і лёгкім жыццё…
Не такую хацела ты долю:
Неахайны твой муж, забыццё…

Завязаўшы фартух свой пад пахі,
Ты і выгляд грудзей сапсуеш,
Муж капрызны саб’е адным махам,
Ад свякроўкі і ты не ўцячэш.

Ты ад працы і чорнай, і цяжкай
Адцвіцеш, не паспеўшы і жыць,
Нібы ў сон упадаеш ты бязважкі:
Для сям’і ўсёй – нянькаю быць.

І на твары ў абітку імкнення,
Паявіцца жыцця поўны, змог
Ясны выраз тугога цярпення
І бяздушны адвечны спалох.

У сырую схаваюць магілу,
Калі пройдзеш ты цяжкі свой шлях,
Тваю марна пагаслую сілу,
Беспатрэбны пажар у грудзях.

Сумна ты не глядзі на дарогу
І за тройкай услед не спяшай,
І тужлівую ў сэрцы трывогу
Назаўсёды хутчэй заглушай.

Не дагнаць табе дзікую тройку:
Коней моцных і сытых, і бойкіх –
І пад хмелем вазніцу! Не ты,
Да каго мчыць карнет малады…

НА ВОЛЗЕ
(Дзяцінства Валежнікава)
Урывак

О Волга! Многа год прайшло,
А сэрца зноў цябе знайшло.
Я ўжо не той, тваё святло
Такое ж, як раней было.
Кругом ўся тая ж далеч, шыр,
Ўсё той жа бачны манастыр
На астраву, сярод пяскоў,
Мінулых дзён я водгук чуў,
Пачуўшы гук святых званоў.
Ўсё тое ж, тое ж… ды няма
Пражытых год і сіл дарма…
Ўжо хутка поўдзень. Спёкай той,
Што на пяску гараць сляды,
Рыбалкі дрэмлюць над вадой
Пасеўшы ў цесныя рады;
З лугоў, дзе конікі куюць,
Крык перапёлак можна чуць.
Прыцішана глядзіць у даль
З лянівай плынню гэтых хваль,
Расшыва рушыць плынь вады,
Юнак, прыказчык малады,
За спадарожніцай сваёй
Бяжыць па палубе: яна
Такая мілая адна.
І чую я, крычыць ён ёй:
“Пастой, гарэза, ўжо задам
Вось даганю!..” Злавіў – дагнаў,
Іх пацалунак прагучаў

Над Волгай смачна, свежа так.
Нас так ніхто не цалаваў!
Ды на румянах вуснаў тых
Ў паненак нашых гарадскіх
І гукаў нат няма такіх.
Ў ружовых марах тых аднак
Забыўся я. а спёка, сон
Мне аддавалі ўжо паклон.
Ды раптам стогны я пачуў,
Пагляд мой бераг азірнуў.
Сагнуўшы галаву амаль
Да ног, закручаных у рвань,
Абутак – лапці, ўздоўж ракі
Паўзлі натоўпам бурлакі,
Быў невыносна дзікі рык
І страшна ясны ў цішыні
Іх мерны пахавальны крык –
Адчуў я сэрца бы ў агні.

О Волга! змалку ты мая!
Ці хто любіў любіў цябе, як я?
Адзін па ранішняй зары,
Калі яшчэ ўсё ў свеце спіць,
Пунцовы бляск ледзь слізгаціць,
Бы з хваляй хоча гаварыць,
Збягаў да роднай я ракі.
Іду на помач рыбакам,
Плыву ў чоўне напрамкі,
Спакой не рушу астравам.
То, як гуляючы звярок,
З высокай стромы на пясок
Скачу, то з берагу ракі
Каменьчык кідаю з рукі,

І песню гучную пяю
Пра ўдаласць раннюю маю…
Тады я думаць быў гатоў,
Сысці не здолее лёс мой
З пясчаных гэтых берагоў.
І быў бы тут, да забыцця –
Калі б, о Волга! над табой
Не чуў я гэтага выцця!

Даўным-даўно, у гэткі ж час,
Яго пачуўшы ў першы раз,
Спалохаўся я і прыглох.
Што значыць ён, я знаць не мог, -
І доўга берагам ракі
Я бег. Прысталі бурлакі,
З расшывы вынеслі кацёл,
Паселі, развялі касцёр
І між сабою павялі
Размову – ціхі разгавор.
- У Ніжні трапім мы калі? –
Адзін сказаў. – Калі б змаглі
Хоць на Іллю… - “Ды, можа, й так, -
Другі, з хваробай твар, бядак,
Яму адказ даў. – Эх, пайшлі б !
Плячо каб толькі зажыло,
Цягнуў бы шлейку, як мядзведзь,
Каб напаткаць да рання смерць –
То б гэта лепш яшчэ было…”
Ён сціх і дагары прылёг.
Я зразумець тых слоў не змог,
Ды той, які іх так сказаў,
Быў хворы і за ўсіх цішэй,
Мяне ўжо больш не пакідаў!

Той вобраз стаў за ўсіх жывей
Ў лахмоццях быў, як жабракі,
І твар быў змораны такі
І выражаючы дакор
Спакойна-безнадзейны змор…

Без шапкі, бледны, ледзь жывы,
Дадому, з болем галавы
Вярнуўся я. І хто тут быў –
Усім я допыт учыніў
На тое, бачыў што, і ў сне
Аб тым, што расказалі мне,
Я трызніў, няньку напужаў:
“Сядзі, мой родненькі, сядзі!
Гуляць сягоння не ідзі!”
Ды я на Волгу “паспяшаў”.

Бог знае, стала што са мной?
Згубіў я на рацэ спакой:
Ступае з цяжкасцю ў пясок
Мая нага: мой бачыць зрок,
Што больш не вабяць астравы
У яркай свежасці травы,
Ўзбярэжных птушак той жа крык
Дзікі, пранізлівы, як рык,
Гамонка хваляў мілых тых
Ужо не музыка святых!
О горка, горка я рыдаў,
Калі тым ранкам я стаяў
На беразе ракі, тады
Я ў першы раз яе назваў
Ракою рабства і нуды.

Што я надумаў той парой,
Сяброў як склікаў за ракой,
Якія клятвы я даваў –
Ўсё хай памрэ ў душы маёй,
Каб толькі хтось не абсмяяў!

Калі ж ды вы – лухта ізноў,
Зарокі маладых гадоў,
Ці вас забыцца хто гатоў?
І выкліканы ваш папрок
Знішчальна-жорсткі мае крок?

Уладзімір ВЫСОЦКІ

Я НЕ ЛЮБЛЮ

Я не люблю фатальнага зыхода
Заўсёды за жыццё я пастаю.
Я не люблю пару любую года
Калі вясёлых песень не пяю.

Тых не люблю, цынізм якія маюць,
Ў захопленасць, не веру, як дзяўчо,
Яшчэ – калі мае лісты чытаюць,
Заглядваючы мне цераз плячо.

Я не люблю, калі – напалавіну,
Размова перарвана – зноў дакор.
Я не люблю і выстралаў у спіну
Яшчэ я супраць выстралаў ва ўпор.

Я ненавіджу плёткі ў стане версій,
Чэрвей сумненні, колкую імглу;
Або – калі ўвесь час ды супраць шэрсці;
Або – калі жалезам ды па шклу.

Я не люблю ўпэўненасці сытай, -
Хай лепей тармазы адкажуць “стоп”.
Мне прыкра слова “гонар” што забыта,
За гонар што прымаецца паклёп.

Калі я бачу зломанае крылле –
Не маю жалю, гэта нездарма:

Я не люблю насілля і бяссілля, -
Распятага Хрыста, шкада, няма.

Я не люблю сябе, калі баюся
Мне прыкра, як невінаватых б’юць.
Як лезуць у душу я не смяюся,
Тым больш – калі ў яе яшчэ плююць.

Я не люблю манежы і арэны:
На і х мільён мяняюць па рублю.
Упарадзе хай будуць перамены –
Ніколі гэта я не палюблю.

***

Так прыйшлося – мужчыны пайшлі,
Пакідалі пасевы да часу, –
Іх не бачылі болей ні разу –
І ў пыле дарог не знайшлі.

Зерні коласа нібы жывыя –
Гэта плачуць са збожжам палі,
І са шчылін вятры ледзяныя
З быстрынёй пацяклі.

Нам чакаць – будзьце з коньмі шпарчэй!
Ў добры час, ў добры час, ў добры час!
Спадарожны хай вецер не б'е, няхай лашчыць вам спіны.
Вербы плачуць па вас,
І без вашых усмешак марнеюць і сохнуць рабіны.

Мы ў высокіх жывём церамах –
Нельга ў тыя зайсці збудаванні:
Адзінота і з ёй спадзяванні
Сталі жыць замест вас у дамах.

Пагубляла і свежасць і вабнасць
Ненадзетых кашуль белізна,
Ды і песень нязвыклая старасць
Ўжо абрыдла спаўна.

Нам чакаць – будзьце з коньмі шпарчэй!
Ў добры час, ў добры час, ў добры час!

Спадарожны хай вецер не б’е, няхай лашчыць вам спіны.
Вербы плачуць па вас,
І без вашых усмешак марнеюць і сохнуць рабіны.

Усё болем адзіным баліць,
І таму з кожным днём без спынення
Векавечны надрыў галашэння
Тых малітваў даўнейшых гучыць.

Мы з паходаў спаткаем вас дальніх,
Пешых, конных, няцэлых – любых, –
Толькі б не пустата пахавальных,
Прадчуванне не іх!

Нам чакаць – будзьце з коньмі шпарчэй!
Ў добры час, ў добры час, ў добры час!
Спадарожны хай вецер не б’е, няхай лашчыць вам спіны.
Вербы плачуць па вас,
І без вашых усмешак марнеюць і сохнуць рабіны.

ШТРАФНЫЯ БАТАЛЬЁНЫ

На артабстрэл гадзіну хтосьці даў –
Гадзіну даў пяхоце перадышкі,
Гадзіну для галоўных самых спраў;
Каму – да ордэна, ну а каму – да вышкі.

За гэты час не пішуцца радкі –
Багам вайны мальба – артылерыстам!
Бо мы не проста так – мы штрафнікі, -
Нам не пісаць: “лічыце камуністам”.

Гарэлку прад атакай – вось мура!
Сваё мы адпілі яшчэ ў “гражданку”,
Пагэтаму мы не крычым “ура” –
Гуляем мы са смерцю ў маўчанку.

У штрафнікоў адзін закон, адзін канец:
Калі, сячы фашысцкага бадзягу!
У грудзі як не зловіш ты свінец –
Медаль на грудзі зловіш за адвагу.

Ты бі штыком, а лепей бі з – рукі:
Яно надзейней, ды яно і цішай, -
Калі ты застанешся ўсё ж жывы –
Гуляй, галота, ад рубля і вышай!

І лічыць вораг: мае перавес, -
Пакінуў шмат ён гарадоў спалёных
На труны лепей вы сячыце лес –
Ў прарыў ідуць штрафныя батальёны!

Вось шэсць нуль-нуль – абстрэлу час настаў, -
Ну, бог вайны, давай без перадышкі!
Гадзіна да галоўных самых спраў:
Каму – да ордэна, а большасці – да “вышкі”…

ЁН НЕ ВЯРНУЎСЯ З БОЮ

І чаму ўсё не так? Так усё – як заўжды:
Тое ж неба ізноў з сінявою.
Той жа лес, і паветра, і тая ж вада…
Не вярнуўся ён толькі што з бою.

Не магу зразумець невіноўны хто з нас
Ў нашых спрэчках без сну і спакою.
Мне не стала хапаць яго ў гэты вось час,
Не вярнуўся як толькі ён з бою.

Ён маўчаў неўпапад і не ў такт падпяваў,
Гаварыў ён заўжды не пра тое,
Ён мне спаць не даваў, на світанні ўставаў, -
Не вярнуўся ўчора ён з бою.

Стала пуста цяпер, – і размова – асцё:
Ўраз заўважыў – было нас то двое…
Для мяне быццам ветрам задзьмула касцёр,
Толькі як не вярнуўся ён з бою.

Зараз рвецца, нібыта з палону, вясна.
Памылкова аклікнуў яго я :
“Друг, пакінь пакурыць!” – а ў адказ – цішыня…
Ён не здолеў прыйсці ўчора з бою.

Не пакінуць нас мёртвыя нашы ў бядзе,
Нашы паўшыя - як вартавыя…
Адбіваецца неба ў лясах бы ў вадзе,
Сталі дрэвы нібы незямныя.

У зямлянцы заўсёды ён быў ля мяне.
Для абодвух – і час працякаў сам сабою…
Ўсё цяпер аднаму – ды здаецца ўсё ж мне –
Гэта я не прыйшоў з таго бою.

ГАРЫЗОНТ

Слядоў каб не было, усюды падмялі…
Сварыцеся са мной, няслаўце, балабоньце:
Мой фініш – гарызонт, а стужка – край зямлі, –
Мне трэба першым быць на гарызонце!

З закладам не ўсе згадзіліся спяшыць
І рукі разбівалі неахвотна.
Умовамі было: каб ехаць – па шашы,
І толькі па шашы – беспаваротна.

Наматваю я мілі на кардан
І еду паралельна правадам, -
Ды толькі цень заўжды перад маторам
То чорны кот, то хтосьці ў нечым чорным.

Я знаю - мне ні раз у колы палкі ткнуць,
Здагадваюся, ў чым і як мяне падмануць.
Я знаю, дзе мой бег з ухмылкай перервуць
І дзе цераз дарогу трос нацягнуць.

Ды стрэлкі я таплю – на гэтых скарасцях
Пясчынка набывае сілу кулі, –
І я сціскаю руль да сутаргі ў кісцях, -
Паспець, пакуль балты не зацягнулі.

Наматваю я мілі на кардан
І еду вертыкальна правадам, –
Закручваюцца гайкі, – тэмп не скінуць! –
Бо там, дзе шыя, трос якраз падымуць.

І плавіцца асфальт, пратэктары кіпяць,
Пад лыжачкаю смокча блізкасцю развязкі.
Я з болем рву грудзьмі нацягнуты канат, -
Жывы – здыміце чорныя павязкі!

Прымусіў хто мяне на жорсткі той заклад –
Той неахайны ў спрэчках і разліках.
Азарт мяне п’яніць, але ці буду рад,
Я тармажу на паваротах-стыках.

Наматваю я мілі на кардан –
На злосць канатам, тросам, правадам, -
Прайграў хто – ўгаварыце, ўрэзоньце,
Калі з’яўлюся я на гарызонце!

Мой фініш – гарызонт – далёкі, як званок,
Я стужку не парваў, але пакончыў з тросам, -
Канат не перасек мой шыйны пазванок,
Але з кустоў страляюць па калёсах.

Мяне сюды на гонку не рублі звялі, –
Мяне прасілі : “Міг не праваронь ты –
Спазнай, ці ёсць мяжа – там, на краі зямлі,
Ці можна там рассунуць гарызонты?”

Наматваю я мілі на кардан
І кулю уляпіць сабе не дам. –
А тармазы адказваюць, – без кода! –
Я гарызонт пералятаю сходу!

БРАЦКІЯ МАГІЛЫ

На брацкіх магілах не ставяць крыжоў,
І ўдовы на іх не рыдаюць –
Прыносяць сюды кветак шмат і вянкоў,
Пры вечным агні ўспамінаюць.

Ўставала раней тут на дыбкі зямля,
А зараз гранітныя пліты.
Тут лёсу ніводнай персоны няма –
Ўсе лёсы ў адзінае зліты.

А ў вечным агні бачны ўспыхнуўшы танк,
У полымі рускія хаты,
Гарыць што Смаленск і гарыць што рэйхстаг
У полымі сэрца салдата.

Ля брацкіх магіл няма слёзных удоў –
Сюды йдуць мацнейшыя людзі,
На брацкіх магілах не ставяць крыжоў…
Ад гэтага лёгка ці будзе?

АЛАВЯНЫЯ САЛДАЦІКІ

Будуць вершы, будуць матэматыкі,
Доўг, пашана і няроўны бой, –
Зараз алавяныя салдацікі
Сталі на старой тут карце ў строй.

Лепей ён трымаў бы ў казарме іх
Толькі – на вайне як на вайне –
Падаюць байцы ў абедзвюх арміях,
Роўны лік на кожнай “старане”

Можа быць – праблемы ў выхаванні іх
І ў навучанні слабіна, –
Ды не здольна выйграваць кампаніі
Тая, ці другая старана.

Спрэчкі ў сумленні акаянныя –
Як не саграшыць перад сабой
Тут і там салдаты алавяныя, –
Хто з іх першы вытрымае бой?

І якая, к д’яблу, там стратэгія,
І якая тактыка, к чарцям!
Здаўся вось нейтралітэт Нарвегіі
Ордам алавяных егіпцян.

Леваю рукою Скандынавія
Ад прэстыжу збаўлена свайго, –
Ды рука рашаючая правая
Мігам аднавіла статус-кво.

Дзе вы, легкадумныя ўсе геніі,
Ці з’яўляцца часу вам няма?
Дзе вы, што цярпелі з паражэннямі
Мукі, перажытыя дарма?

Ці не вы, што неслі ў вянцы зару,
І трубілі пераможна ў рог, –
Дзе вы, прыпадобненыя Цэзару,
Што прыйшоў, убачыў, перамог?

Палкаводзец не зусім удаленькі
З непасільна-цяжкай ношай ён,
Выйшаў ў велізарныя начальнікі
Мой шасці гадоў Напалеон.

Мукі каб спыніць яго з сумненнямі,
Тых салдат палову роўна даць
Змаляваў я сінім – жарты генія, –
Ранкам бачу – сінія ляжаць.

Ганаруся поспехам, ды ўсё ж адна
Думка, што не ведае зыход;
Як рашыў ён, што загінуць іменна
Сінія, а не наадварот.

***

Штовечар мне запальваюцца свечкі
І вобраз твой абкурвае хай дым,
І не хачу я ведаць, час што лечыць,
Што ўсё праходзіць разам з ім.

Я болей не пазбаўлюся спакою:
Бо ўсё, што ўперад на душы было на год,
Не знаючы, яна ўзяла з сабою –
Спачатку ў порт, затым – у самалёт.

Штовечар мне запальваюцца свечкі
І вобраз твой абкурвае хай дым,
І не хачу я ведаць, час што лечыць,
Што ўсё праходзіць разам з ім.

Ў душы маёй – пустынная пустыня, –
Ну што вы сталі над пустой маёй душой!
Абрыўкі песень там і павуцінне, –
Бо ўсё астатняе яна ўзяла з сабой.

Цяпер запальвае мне вечар свечкі,
І вобраз твой абкурвае хай дым,
І не хачу я ведаць, час што лечыць,
Што ўсё праходзіць разам з ім.

Ў душы маёй – ўсе мэты без дарогі, –
Парыйцеся – не знойдзеце вы звыш,
Як дзве паўфразы і паўдыялогі,
Астатняе ўсё – Францыя, Парыж.

Няхай запальвае мне вечар свечкі,
І вобраз твой абкурвае хай дым,
Ды не хачу я ведаць, час што лечыць,
Што ўсё праходзіць разам з ім.

ЗМЕСТ

ВЕРШЫ

ЖЫЦЦЁ ЗА ЎСЁ ДАРАЖЭЙ
БЕЗ ВЕСТКІ
СПАЛЕНАЯ ВЁСКА
СПОВЕДЗЬ
ВАЛЬС ПАД ДАЖДЖОМ
Я ДА ЦЯБЕ ІШЛА
ПРЫЗНАННЕ
*** Хвала рукам, што пахнуць хлебам…
НЕ ПАКІНЬ
*** Песняру беларускай зямлі…
НЕ СПІЦЦА
*** Быў Чарнобыль...
*** Заблуджуся аднойчы ў жнівеньскіх росах…
ВЫТОКІ
ПЕРШЫЯ СНЯЖЫНКІ
*** Мне сніўся сёння ранак вераснёўскі…
*** З бяроз упалі першыя лісты…
АПОШНЯЯ СУСТРЭЧА
СОНЦА І МЕСЯЦ
*** Чаму грукоча гром, скажы…
*** Папонаю пакрыты конскі круп…
МАЛІТВА
*** Нам хочацца зімой дажджоў вясновых…
*** Праз гады я ішла…
МАМЕ
МАЙМУ БРАТУ
НА НОВАЙ ЗЯМЛІ

ПЕРАКЛАДЫ

Аляксандр ПУШКІН
*** Узвёў я помнік для сябе нерукатворны…
*** Я вас кахаў: каханне шчэ, быць можа…
НЯНЬЦЫ
*** Я помню дзіўнае імгненне…
ЗІМНІ ВЕЧАР
ВЯЗЕНЬ

Сяргей ЯСЕНІН

ПУШКІНУ
САБАКУ КАЧАЛАВА
ЛІСТ ДА МАЦІ
*** Шаганэ ты мая, Шаганэ…
*** Не шкада, не клічу і не плачу…

Іван КРЫЛОЎ

СВІННЯ ПАД ДУБАМ
ВОЎК І ЯГНЯ
ЛІСІЦА І ВІНАГРАД
ВАРОНА І ЛІСІЦА
СТРАКАЗА І МУРАШКА
КВАРТЭТ

Міхаіл ЛЕРМАНТАЎ

СМЕРЦЬ ПАЭТА
ВЕТРАЗЬ

Мікалай НЯКРАСАЎ

НЯЗЖАТАЯ ПАЛАСА
ТРОЙКА
НА ВОЛЗЕ

Уладзімір ВЫСОЦКІ

Я НЕ ЛЮБЛЮ
*** Так прыйшлося – мужчыны пайшлі…
ШТРАФНЫЯ БАТАЛЬЁНЫ
ЁН НЕ ВЯРНУЎСЯ З БОЮ
ГАРЫЗОНТ
БРАЦКІЯ МАГІЛЫ
АЛАВЯНЫЯ САЛДАЦІКІ
*** Штовечар мне запальваюцца свечкі…

Літаратурна-мастацкае выданне

ГАСЦІЛОВІЧ Зінаіда Геранімаўна

Я ДА ЦЯБЕ ІШЛА

Вершы і пераклады

Рэдактар
Н. І. Мельнічэнка

Дызайн вокладкі
і камп'ютарная вёрстка
Л. У. Гатавіцкая

ГА "Мінскае абласное аддзяленне
Саюза пісьменнікаў Беларусі".
Пл. Свабоды, 13-1, 220013, г. Мінск.
Тэл./факс: 8(017) 347 08 60.
E-mail: maaspb.m@yandex.by
www.maaspb.by